УДК 323.2(662.1)

# Спроба стварэння Ісламскай дзяржавы Азавад і дзейнасць салафіцкіх груповак на поўначы Рэспублікі Малі

**Юрчак Дз.В., Якаўлева-Юрчак А.М.**
***Установа адукацыі "Віцебскі дзяржаўны ўніверсітэт імя П.М. Машэрава", Віцебск***

*У артыкуле паказваецца сітуацыя, якая склалася на пачатку XXI стагоддзя на поўначы Малі. Вызначаюцца прычыны і асаблівасці выступлення ваяўнічых плямён туарэгаў, а таксама наступствы стварэння Незалежнай дзяржавы Азавад, у тым ліку актывізацыя радыкальных ісламскіх груповак, якія перахапілі ініцыятыву ў сепаратыстаў і стварылі сваю дзяржаўнасць. Асаблівая ўвага надаецца пытанню барацьбы з радыкальнымі ў ісламістамі, а таксама гісторыі стварэння салафіцкіх арганізацый, якія стаяць за большасцю тэрарыстычных актаў на тэрыторыі Малі і сумежных дзяржаў.*

*Мэта даследавання – аналіз сітуацыі на поўначы Малі, што выявілася ў выступленні туарэгскіх плямён, абвяшчэнні Ісламскай дзяржавы Азавад і дзейнасці разнастайных салафіцкіх тэрарыстычных груповак, якія пагражаюць стабільнасці на захадзе Сахары і Сахеля.*

***Матэрыял і метады.*** *Пры напісанні артыкула выкарыстоўваліся агульнанавуковыя (аналіз, сінтэз, індукцыя, дэдукцыя і г.д.) і прыватныя метады гістарычнай навукі (гісторыка-генетычны, гісторыка-параўнальны і гістарычнай рэтраспекцыі). Крыніцамі пры падрыхтоўцы артыкула сталі аналітычныя работы па названай тэматыцы і інфармацыйныя паведамленні ў франкамоўных сродках масавай інфармацыі.*

***Вынікі і іх абмеркаванне.*** *Аналіз крыніц дазволіў прасачыць складаныя этнапалітычныя працэсы на поўначы Малі, вызначыць прычыны і вынікі выступлення туарэгаў у 2012 годзе, акрэсліць актывізацыю дзейнасці салафіцкіх арганізацый у раёне Азавада і асаблівасці іх стварэння.*

***Заключэнне.*** *Прычынай выступлення туарэгаў стала дэстабілізацыя сітуацыі ў суседняй Лівіі і ўсёй паўночнай Афрыцы, што выклікала вяртанне значнай колькасці туарэгаў у Малі, дзе яны спрабавалі стварыць сваю дзяржаўнасць. Гэтым скарысталіся прыхільнікі радыкальнага ісламу, якія былі прадстаўлены некалькімі арганізацыямі, яны ажыццявілі спробу стварэння ўласнай дзяржавы на поўначы Малі. Толькі ўмяшальніцтва французскіх войскаў не дало ім гэтага зрабіць, але сітуацыя ў дзяржаве і па сённяшні дзень застаецца нестабільнай.*

***Ключавыя словы:*** *Малі, туарэгі, Азавад, тэрарызм, ісламскі фундаменталізм, Аль-Кайда.*

*(Ученые записки. – 2016. – Том 21. – С. 5–10)*

# An Attempt to Create the Islamic State of Azawad, Activities of Salafi Groups in the North of the Republic of Mali

**Yurchak Dz.V., Yakauleva-Yurchak A.M.**
***Educational Establishment "Vitebsk State P.M. Masherov University", Vitebsk***

*The article describes the situation at the beginning of the XXI century in the north of Mali. The cause and features of warlike tribes of the Tuareg as well as consequences of the creation of the Independent State of Azawad are identified, including activation of Islamic radical groups and separatists to seize the initiative and create their own state. Particular attention is paid to the fight against radical Islamists, as well as the history of Salafist organizations which are behind most of the terrorist acts on the territory of Mali and neighboring countries.*

*The purpose of this article is the analysis of the situation in northern Mali, which manifested itself in the rebellion of Tuareg tribes, proclaiming the Islamic State of Azawad and activities of Salafist terrorist groups that threaten the stability of the Western Sahara and the Sahel.*

***Material and methods.*** *When writing this article we used scientific methods (analysis, synthesis, induction, deduction, etc.) and private methods of historical science (historical-genetic, historical and comparative method and historical flashbacks). The sources were analytical articles on this subject and the informational messages in the French-speaking media.*

***Findings and their discussion.*** *The analysis allowed to trace the sources of the complex ethno-political processes in the north of Mali, to determine the causes and results of the Tuareg rebellion in 2012, to outline the revitalization of Salafist organizations in the region of Azawad and peculiarities of their creation.*

***Conclusion.*** *The cause of the Tuareg rebellion was destabilizing of the situation in neighboring Libya and across North Africa, which caused the return of a significant number of Tuaregs in Mali, where they were trying to create their own state. The supporters*

*Адрас для карэспандэнцыі: e-mail:* kajuga@list.ru – **Дз.В. Юрчак**

*of radical Islam took advantage of this; they were presented by several organizations and carried out an attempt to create their own state in the north of Mali. Only the intervention of French troops prevented them from do this, but the situation in the state still remains unstable.*

***Key words:*** *Mali, the Tuareg, Azawad, terrorism, Islamic fundamentalism, al-Qaida.*

*(Scientific notes. – 2016. – Vol. 21. – P. 5–10)*

У цэнтры ўвагі передавых артыкулаў сусветных медый 20 лістапада 2015 года ізноў апынулася сталіца Малі Бамака. На гэты раз прычынай падобнай увагі да афрыканскага горада стала сітуацыя, звязаная з чарговай атакай тэрарыстаў на замежных грамадзян у атэлі "Рэдзісан Блю". Такім чынам, гучна праявілі сябе тэрарыстычныя групы Заходняй Афрыкі, якія ў апошні час яўна знаходзіліся на другім плане на фоне актыўнасці салафітаў так званай "Ісламскай дзяржавы". Пры гэтым многія ўжо забыліся, што на поўначы Малі ў 2012 г. на практыцы мог быць рэалізаваны праект пабудовы дзяржавы ісламскіх фундаменталістаў, і толькі актыўныя дзеянні французскіх войск падчас рэалізацыі на практыцы аперацыі "Сервал" не далі гэтага ажыццявіць.

Мэта даследавання – аналіз сітуацыі на поўначы Малі, што выявілася ў выступленні туарэгскіх плямён, абвяшчэнні Ісламскай дзяржавы Азавад і дзейнасці разнастайных салафіцкіх тэрарыстычных груповак, якія пагражаюць стабільнасці на захадзе Сахары і Сахеля.

На вялікі жаль, дадзеная тэматыка амаль не вывучалася ў беларускай гістарыяграфіі. Гэта абумоўлена тэрытарыяльнай аддаленасцю і тым, што падзеі адбыліся адносна нядаўна, а іх вынікі мы працягваем назіраць у паўночна-заходняй Афрыцы і па сённяшні дзень. У расійскай гістарычнай і палітычнай навуцы з'явіўся шэраг публікацый па дадзенай тэме. Пра гэта сведчаць работы І. Ігнатчанкі і В. Філіпава [1–2]. Пэўная колькасць прац належыць еўрапейскім і амерыканскім вучоным. Прычым найбольшая колькасць даследаванняў па малійскай гісторыі выканана ў Францыі, што абумоўлена гістарычнымі сувязямі былой калоніі і метраполіі.

**Матэрыял і метады.** Пры напісанні артыкула выкарыстоўваліся як аналітычныя работы па названай тэматыцы, так і інфармацыйныя паведамленні ў франкамоўных сродках масавай інфармацыі, якія дазволілі дасягнуць пастаўленай мэты і прасачыць эвалюцыю салафіцкіх груп на поўначы Малі. Аўтарамі былі выкарыстаны агульнанавуковыя (аналіз, сінтэз, індукцыя, дэдукцыя і г.д.) і прыватныя метады гістарычнай навукі. Сярод апошніх варта прыгадаць гісторыка-генетычны, гісторыка-параўнальны і метад гістарычнай рэтраспекцыі.

**Вынікі і іх абмеркаванне.** У 2012 г. Малі ахапіў палітычны крызіс, які распачаўся з выступлення туарэгаў. Складанасці з гэтым народам для чорнага кантынента не з'яўляюцца новымі. Туарэгскае пытанне спарадзілі каланізатары яшчэ ў пазамінулым стагоддзі. На Берлінскай канферэнцыі ў лістападзе 1884 г. – лютым 1885 г. еўрапейскія кіраўнікі дамовіліся пра прынцыпы акупацыі афрыканскіх зямель і канфігурацыю палітычных межаў у Афрыцы. Пасля Другой сусветнай вайны французы, пакідаючы свае афрыканскія калоніі, захавалі штучна вызначаныя межы без уліку рассялення мясцовых народнасцей. Верагодна, гэта было зроблена для таго, каб у далейшым захоўваць ролю арбітра ў развіцці няпростых стасункаў новых афрыканскіх дзяржаў. Таму Рэспубліка Малі стала дзяржавай адразу для 25 разнастайных этнічных груп, сярод якіх апынуліся народы, расселеныя кампактна на тэрыторыі дзяржавы (бамбара, малінке, дагоны, сенуфо, бабо і інш.), што пражываюць па ўсёй тэрыторыі рэспублікі (фульбэ, тукулеры), а таксама качавыя народы поўначы (маўры, арабы, туарэгі). Апошнія з качэўнікаў засялялі не толькі Малі. Прыгаданыя вышэй былыя французскія межы прывялі да таго, што гэты народ стаў засяляць тэрыторыю пяці афрыканскіх краін: Малі, Буркіна-Фасо (раней Верхняя Вольта), Нігера, Алжыра і Лівіі. Пры гэтым з-за адсутнасці належнага кантролю над межамі і адкрытага ігнаравання штучнага падзелу туарэгі рэгулярна качавалі паміж дзяржавамі.

Разам з тым вольналюбівыя туарэгі не пакідалі думак пра ўласную незалежную дзяржаву ў Сахары, якую яны называлі "Азавад", што пагражала стабільнасці ў Заходне-Афрыканскім рэгіёне. Таму толькі на тэрыторыі Малі да 2012 года адбыліся тры маштабныя туарэгскія паўстанні. Першае з іх у 1960-х гадах падавілі з дапамогай французскіх войскаў. Паўстанні 1990–1995 і 2007–2009 гадоў былі крывавымі, і супакоіць качэўнікаў атрымалася ў першым выпадку дзякуючы вынікам малійскай рэвалюцыі 1991 года і звяржэнню дыктатара Мусы Траорэ, які аказаўся няздольным падавіць выступленне ваенным шляхам, у другім выпадку – праз дапамогу лівійскага лідара Муамара Кадафі.

Апошні актыўна выкарыстоўваў туарэгаў у сваіх мэтах. У прыватнасці, ён даў прыстанішча на тэрыторыі Лівіі качэўнікам, якія пакідалі Малі падчас маштабных засух, што суправаджаліся голадам, і ўзгаданых вышэй паўстанняў. Каля 2 тысяч туарэгаў служылі ў элітным Панафрыканскім легіёне і стваралі найбольш баяздольныя сілы арміі Лівіі. Акрамя таго, М. Кадафі вылучыў ідэю стварэння федэрацыі “Вялікая Сахара”, якая прадугледжвала шырокую аўтаномію для туарэгаў. Падчас пастаянных канфліктаў з удзелам ваяўнічых туарэгаў Кадафі рэгулярна выступаў пасрэднікам на перамовах. Падтрымліваючы на тэрыторыях афрыканскіх дзяржаў ачагі ўнутранай напружанасці з дапамогай туарэгаў, палкоўнік істотна павялічваў свой палітычны ўплыў у гэтых краінах. У выніку туарэгскае пытанне стала добрым рычагом уздзеяння на ўрады Малі, Нігера і Буркіна-Фасо [1].

Акрамя таго, сітуацыя ў Малі ўскладнялася тым, што супрацьстаянне розных народаў дзяржавы было абумоўлена гістарычна і захоўвалася ў памяці разнастайных этнічных груп. Так, аселыя земляробы і рыбакі (плямёны, якія размаўляюць на мовах манда і сангай), што складаюць вялікую частку жыхароў Малі, жывуць на шчыльна заселеным паўднёвым усходзе краіны. Носьбіты мовы фульбэ займаюцца развядзеннем буйной рагатай жывёлы на паўднёва-заходніх яе ўскраінах. У той жа час на вялікіх прасторах поўначы Малі (па правы бок ад ракі Нігер) пражываюць пераважна жывёлаводы-качэўнікі, у тым ліку і туарэгі. Складаная кампазіцыя моў, культур і традыцый сама па сабе тоіць небяспеку ўзнікнення канфліктаў. Сітуацыя ўскладняецца тым, што гістарычная памяць малійцаў захоўвае вобразы ворагаў. На працягу ўсёй гісторыі краіны земляробы пакутавалі ад набегаў качэўнікаў, якія актыўна ўдзельнічалі ў гандлі рабамі. Туарэгі і дагэтуль рабуюць караваны на транссахарскіх шляхах, займаюцца захопам людзей, гандлююць зброяй і наркотыкамі [2].

Падзеі 2011 года ў Лівіі карэнным чынам змянілі сітуацыю на поўначы Малі. Пасля гібелі Муамара Кадафі туарэгі як найбольш адданыя яго прыхільнікі сталі па сутнасці персонамі non grata і з восені 2011 года ў мэтах асабістай бяспекі былі вымушаныя пакінуць гэтую краіну. Былы консул Лівіі ў Малі туарэг Муса Куні спрабаваў дамовіцца з новымі лівійскімі ўладамі аб уключэнні туарэгаў у сілавыя структуры посткадафіскай Лівіі, але беспаспяхова [1]. Выход туарэгаў змяніў сітуацыю ў Малі, бо колькасць гэтага ваяўнічага народа ў дзяржаве адразу павялічылася ў некалькі разоў. Больш за тое, калі туарэгі атрымалі ў Лівіі баявы вопыт, а таксама і сучасную зброю (у тым ліку захопленую ў апазіцыйных груповак), яны сталі сілай, якая магла эфектыўна супрацьстаяць нематываванай малійскай арміі. Апошняя была ўкамплектавана старой савецкай зброяй і налічвала не больш за 5000 салдат. Нават сёння пасля дапамогі звонку ўзброеныя сілы Малі налічваюць каля 8000–8200 чалавек [3], што надзвычай мала для дзяржавы, плошча якой пераўзыходзіць плошчу Францыі ў два разы.

У выніку напрыканцы 2011 года праз аб’яднанне некалькіх сепаратысцкіх арганізацый быў створаны Нацыянальны рух за вызваленне Азавада (Mouvement National de Libération de l’Azawad – MNLA). А ў студзені 2012 года на поўначы Малі распачаліся баявыя дзеянні туарэгаў супраць рэгулярных войскаў. Апошнія былі дэмаралізаваныя і няздольныя аказаць істотнае супраціўленне. Больш за тое, сярод ваенных пачаліся хваляванні, якія прывялі да ваеннага перавароту і звяржэння Прэзідэнта Малі Амаду Тумані Турэ (Amadou Toumani Tour ). Увесь парадокс гэтага перавароту ў тым, што да заканчэння прэзідэнцкага тэрміну заставалася толькі некалькі месяцаў, а сам кіраўнік дзяржавы не збіраўся ўдзельнічаць у новых выбарах. Таму многія аналітыкі палічылі, што пераварот быў арганізаваны звонку, тым больш лідар хунты капітан Амаду Санаго (Amadou Sanogo) праходзіў ваенную падрыхтоўку ў ЗША [2]. Сапраўды, гэта магло карэнным чынам змяніць расклад сіл напярэдадні новых выбараў. Але варта ўлічваць і тое, што гэта мог быць пратэст супраць палітыкі, якая праводзілася на поўначы Малі, і адначасова просты спосаб адмовіцца ад вайны з туарэгамі (агалоўнае, захаваць жыццё) для дэмаралізаваных салдат. Загадкавым выглядае гэты пераварот і па той прычыне, што яго арганізатары пад пагрозай увядзення санкцый праз два тыдні добраахвотна і без асаблівых умоў адмовіліся ад улады. Тым самым Малі вярнулася да дэмакратыі, хаця ўся поўнач краіны была непадкантрольная ўраду.

6 красавіка 2012 г. MNLA абвясціў стварэнне Незалежнай дзяржавы Азавад (Azawad), якая аб’яднала тры паўночныя рэгіёны: Гао, Цімбукту і Кідаль. Гэта 825,000 км$^2$ (2/3 тэрыторыі Малі і 10% насельніцтва краіны). 7 чэрвеня 2012 г. быў створаны Часовы ўрад Азавада. Паралельна стала відавочным, што сярод

туарэгаў адсутнічае адзінства. Па-першае, яго не было ніколі, бо племя было падзелена на кланы і групоўкі, якія рэгулярна супрацьстаялі паміж сабою. Па-другое, сярод туарэгаў у барацьбе з малійскім урадам вылучаліся дзве вялікія групы: свецкая MNLA, якая выступала з сепаратысцкімі мэтамі, і разнастайныя салафіцкія групы, якія марылі пра ўстанаўленне дзяржавы, пабудаванай на прынцыпах шарыяту і не выключалі экспарту паўстання за межы ўзятых пад кантроль правінцый. І хаця напачатку 2012 года гэтыя сілы дзейнічалі сумесна, у канцы вясны ў іх асяроддзі намеціўся сур'ёзны разлад. Ён быў выкліканы нежаданнем большасці туарэгаў жыць па законах шарыяту. Тым больш традыцыі саміх туарэгаў (асабліва матрыярхат) ніяк не ўпісваліся ў каноны салафізму. Акрамя таго, прыхільнікі MNLA вельмі адмоўна сустрэлі аб'яднанне джыхадзістаў, яно намецілася 26 мая 2012 г. праз заключэнне дагавора паміж самымі ўплывовымі фундаменталісцкімі групоўкамі ў рэгіёне "Ансар ад-Дзін" (Ansar Dine ці Ansar ad-Din) і "Аль-Кайдай ісламскага Магрыбу" (Al-Qaïda au Maghreb islamique), якія стварылі так званую Пераходную раду Ісламскай дзяржавы Азавад [4].

Усё гэта прывяло да адкрытага супрацьстаяння. 26 чэрвеня 2012 г. ісламісты з групоўкі "Рух за адзінства і джыхад у Заходняй Афрыцы" (Mouvement pour l'unicit  et le jihad en Afrique de l'Ouest) узялі пад кантроль Гао, які раней утрымлівалі туарэгі Азавада. 27 чэрвеня салафіты выбілі туарэгаў з Цімбукту і Кідаля, а да сярэдзіны ліпеня занялі апошні бастыён MNLA – Ансага, размешчаны за 100 км на паўднёвы ўсход ад Гао. 15 ліпеня 2012 г., пасля таго як Азавад апынуўся пад кантролем ісламістаў, яго ўлады паведамілі, што адмаўляюцца ад ідэі незалежнасці на карысць аўтаноміі. Салафіты ж абвясцілі пра стварэнне Ісламскай дзяржавы Азавад [5].

У канцы верасня 2012 года ўрад Малі распаўсюдзіў зварот з заклікам накіраваць на поўнач дзяржавы міжнародны ваенны кантынгент для барацьбы з салафіцкімі групоўкамі. Эканамічная супольнасць Заходняй Афрыкі пачала падрыхтоўку да ваеннай аперацыі ў Малі і заявіла пра гатоўнасць накіраваць у рэгіён 3300 ваеннаслужачых з краін Афрыканскага саюза. Афіцыйны Парыж пагадзіўся ажыццяўляць інструктаж ваенных і агульнае кіраўніцтва. Але гэтых сіл ва ўмовах поўнай дэмаралізацыі было б недастаткова [5].

Сітуацыя пачала рэзка змяняцца ў пачатку 2013 года. Кіруемыя ідэяй распаўсюджання Ісламскай дзяржавы Азавад за кошт паўднёвай часткі Малі баевікі радыкальных салафіцкіх груповак пачалі наступ. 10 студзеня 2013 г. яны захапілі населены пункт Кона. У сваю чаргу, 11 студзеня французскія сілы з авіяналёту на пазіцыі салафітаў распачалі ваенную аперацыю "Сервал" (назва пустыннага драпежнага ката) на поўначы Малі. На наступны дзень у аперацыі ўжо былі задзейнічаны сухапутныя войскі. Дзеянні Францыі выклікалі рэзкую рэакцыю джыхадзісцкіх груповак. У прыватнасці, прэс-сакратар Аль-Кайды ісламскага Магрыбу назваў французаў інтэрвентамі і крыжаносцамі, а таксама параіў "капаць магілы для сваіх сыноў" [6].

Супрацьстаяць французам маглі даволі сур'ёзныя сілы джыхадзістаў. Па ацэнках даследчыкаў, групоўка "Ансар ад-Дзін" налічвала ад 5000 да 10000 баевікоў, "Аль-Кайда ісламскага Магрыбу" – каля 1000, "Рух за адзінства і джыхад у Заходняй Афрыцы" – 500. Прычым самае баявое ядро салафітаў дасягала 3000 байцоў [7]. Таму французская армія не магла разлічваць на тое, што баявыя дзеянні на вялікіх абшарах супраць такіх сіл праціўніка будуць хуткімі і эфектыўнымі.

Але ўжо да канца зімы 2013 года французы выбілі джыхадзістаў з буйных населеных пунктаў, тым не менш ліквідаваць усе іх базы ў пустынных раёнах Сахары і Сахеля не атрымалася. Летам кіраўніцтва Францыі заявіла пра завяршэнне аперацыі "Сервал" і пачатак новай аперацыі "Бархан", у якой планаваўся таксама ўдзел войскаў Буркіна-Фасо, Малі, Маўрытаніі, Нігера і Чада. Адначасова на тэрыторыі Малі былі разгорнуты сілы ААН – Шматпрофільная комплексная місія Арганізацыі Аб'яднаных Нацый па стабілізацыі ў Малі (МІНУСМА). Але ўсе дзеянні замежных дзяржаў не дазволілі цалкам ліквідаваць асноўныя групоўкі джыхадзістаў, якія працягваюць дзейнічаць на тэрыторыі Малі і сумежных дзяржаў і зараз.

Французская ваенная аперацыя "Сервал" прывяла да значных страт сярод джыхадзістаў. Гэта прымусіла "Аль-Кайду ісламскага Магрыбу" аб'яднаць свае сілы з "Ансар ад-Дзін". Па стане на 2014 г. экспертамі іх колькасць ацэньвалася менш за 700 чалавек для мясцовай "Аль-Кайды" і каля 800 для прыхільнікаў "Ансар ад-Дзіна" [8].

Як узгадвалася вышэй, сілы салафітаў у Малі былі прадстаўлены некалькімі арганізацыямі. Іх аб'ядноўвалі ідэі вяртання да "чыстага ісламу" і пабудовы ісламскай дзяржаўнасці, з апорай на законы шарыяту. Пры гэтым кантроль над многімі рэгіёнамі Малі ў свой час яны ўзялі дзякуючы ваеннаму патэнцыялу, а таксама выкарыстанню

ўнутраных племянных асаблівасцей і супярэчнасцей. Але сярод салафітаў Малі поўнай еднасці таксама няма. Адзінае, што іх аб’ядноўвае ў апошні час, – гэта цесная сувязь з крыміналам і супрацьстаянне “Ісламскай дзяржаве”, апошняе выклікана барацьбой за лідарства сярод ісламістаў на сусветным узроўні, а малійскія групоўкі (дакладней іх лідары) у гэтым супрацьстаянні пакуль займаюць бок “Аль-Кайды”.

Самай уплывовай арганізацыяй ісламістаў Малі з’яўляецца “Ансар ад-Дзін” (з арабскага – “абаронцы веры”), яна заснаваная ў канцы 2011 г. былым актыўным удзельнікам туарэгскага паўстання 1990–1995 гг. Іядам Аг Галі (Iyad Ag Ghali, па мянушцы “Ліс пустыні”). Гэты сын пастуха на момант стварэння арганізацыі быў вядомым туарэгскім палітычным дзеячам. У вой час ён служыў у Ісламскім легіёне Кадафі. У 1990-х гадах Аг Галі дасягнуў прымірэння туарэгаў з кіраўніцтвам Малі, за гэта атрымаў пасаду ва ўрадзе дзяржавы, а затым быў прызначаны ганаровым консулам Малі ў Саўдаўскай Аравіі. Менавіта ў гэты час Аг Галі пачынае актыўнае супрацоўніцтва з рознымі салафіцкімі групоўкамі. Карыстаючыся сваім аўтарытэтам, ён неаднойчы кантактаваў з прыхільнікамі крайняга ісламу ў Малі і выступаў у якасці пасрэдніка пры вызваленні захопленых еўрапейцаў. Разлічваў Аг Галі і на вядучую ролю ў кіраўніцтве Азавада, але лідары MNLA з-за радыкальных рэлігійных поглядаў апошняга не прапанавалі пасады, на якую мог разлічваць палітык такога маштабу, што і прымусіла яго стварыць уласную арганізацыю [9]. Галоўным адрозненнем “Ансар ад-Дзін” з’яўляецца тое, што ў яе складзе пераважаюць адны туарэгі, якія прынялі радыкальны іслам.

Пры гэтым не трэба блытаць гэтую тэрарыстычную групоўку з аднайменнай малійскай арганізацыяй “Ansar ed-Dine”, заснаванай яшчэ ў 1992 годзе ў Бамака. Лідарам гэтай легальнай ісламскай групы з’яўляецца Шэрыф Усман Хайдара (Chérif Ousmane Haïdara), віцэ-прэзідэнт Вярхоўнай ісламскай рады Малі. Па стане на 2013 г. названая арганізацыя налічвала 800 тысяч чалавек і мела свае філіялы ў многіх дзяржавах Афрыкі і нават Францыі. Сам Шэрыф Усман Хайдара наступным чынам ацэньваў з’яўленне аднайменнай тэрарыстычнай групоўкі: “Яны ўзялі нашу назву, каб скарыстацца нашай папулярнасцю і стварыць блытаніну, таму што яны ведаюць што мы суфіі, жорстка выступаем супраць вахабізму, як і ўсіх формаў фундаменталізму” [10].

Другая ўплывовая салафіцкая групоўка на поўначы Малі – “Аль-Кайда ісламскага Магрыбу”, якая з’яўляецца інтэрнацыянальнай тэрарыстычнай арганізацыяй (на фоне туарэгскага “Ансар ад-Дзіна”), і сама назва яе падкрэслівае сувязь з “Аль-Кайдай”. Арганізацыя ўзнікла 25 студзеня 2007 г. на аснове алжырскай па паходжанні “Салафіцкай групы пропаведзі і змагання” (Groupe Salafiste pour la Prédication et le Combat), заснаванай у 1996 г. Хасанам Хатабам (Hassan Hattab). Гэтая фундаменталісцкая ўзброеная групоўка размешчана ў Алжыры, але здзяйсняе акцыі ў сумежных краінах, уключаючы Малі. На думку спецыялістаў, у апошнія гады янаператварылася ў найбольш эфектыўнае і багатае падраздзяленне “Аль-Кайды”, абыйшоўшы яе арабскія і афганска-пакістанскія структуры [6].

У 2011 г. ад “Аль-Кайда ісламскага Магрыбу” адкалоўся “Рух за адзінства і джыхад у Заходняй Афрыцы”, які складаецца ў асноўным з арабаў, што пражываюць у раёне Цімбукту, і алжырцаў [7]. Менавіта гэтая групоўка падчас спробы абвяшчэння Ісламскай рэспублікі Азавад кантралявала такі буйны горад, як Гао. Адной жа з самых вядомых іх вылазак стаў захоп адразу сямі алжырскіх дыпламатаў.

Другім асколкам ад “Аль-Кайды ісламскага Магрыбу” стала групоўка “Падпісаныя крывёю” (Les Signataires par le sang), апошняя набыла самастойнасць са снежня 2012 г. Узначаліў гэтую групу харызматычны ўдзельнік вайны ў Афганістане Мохтар Бельмохтар (Mokhtar Belmokhtar, ён жа “Аднавокі” і “Містэр Мальбара”), пра смерць якога заходнія спецслужбы паведамлялі ў апошнія гады некалькі разоў. Але гэтая інфармацыя не пацвярджалася іншымі крыніцамі. Месцам базіравання “Падпісаных крывёю” таксама стаў горад Гао [11].

Апошняе абумовіла іх цеснае супрацоўніцтва з “Рухам за адзінства і джыхад у Заходняй Афрыцы”. Вынікам гэтага супрацоўніцтва стала аб’яднанне двух груповак пры падтрымцы кіраўніка “Аль-Кайды” Аймана Аль-Завахіры. Гэта афіцыйна адбылося 22 жніўня 2013 г. А новая тэрарыстычная групоўка атрымала назву “Аль-Марабітун” (Al Mourabitoune), тым самым яна была названа ў гонар мусульманскай паўночнаафрыканскай дынастыі Альмаравідаў, якая існавала ў XI–XII стст. [12].

Менавіта гэта арганізацыя і стаяла за тэрарыстычным актам у Бамака, які адбыўся ў лістападзе 2015 года. Чарговая вылазка

“Аль-Марабітун” паказала, што сітуацыя ў Малі застаецца нестабільнай нават пасля нядаўняга падпісання мірнай дамовы паміж урадам і вядучымі палітычнымі сіламі Азавада. Салафіты ў мірным працэсе не ўдзельнічалі, таму яны гатовы працягваць барацьбу супраць афіцыйнага Бамака, замежнага вайсковага кантынгенту і ўмераных палітычных сіл поўначы Малі. Вялікія і не падкантрольныя поўнасцю прасторы Сахары і Сахеля ствараюць для гэтага спрыяльныя ўмовы. А гандаль наркотыкамі, зброяй, атрыманне выкупаў за закладнікаў дае надзейны эканамічны падмурак для прыцягнення новых баевікоў і працягу барацьбы.

**Заключэнне.** Такім чынам, туарэгскае пытанне, якое існавала ў Малі з самага ўзнікнення дзяржавы, асабліва абвастрылася пасля звяржэння ў Лівіі рэжыму М. Кадафі. Гэта прывяло да ўцёкаў значнай колькасці ваяўнічых туарэгаў з Лівіі ў Малі, дзе яны дэстабілізавалі і без таго складаную сітуацыю. Вынікам узброеных сутыкненняў з урадавымі войскамі стала абвяшчэнне Незалежнай дзяржавы Азавад. Складанай сітуацыяй скарысталіся прыхільнікі радыкальнага ісламу, якія ўтварылі Ісламскую дзяржаву Азавад і выступілі з ідэяй пашырэння халіфата на ўсю тэрыторыю Малі. Салафіцкі дзяржаўны праект ва ўмовах французскай ваеннай дапамогі ўраду Малі аказаўся нежыццяздольным. На жаль, поўнасцю ліквідаваць джыхадзісцкія групоўкі ў раёне Сахары і Сахеля не атрымалася. І складана ўявіць, якім чынам на такой вялікай плошчы гэта можна зрабіць. Таму “Ансар ад-Дзін”, “Аль-Кайда ісламскага Магрыбу” і “Аль-Марабітун” працягваюць уяўляць вялікую небяспеку ў рэгіёне як для ўрада і мясцовага насельніцтва, так і для замежных грамадзян, якія не вельмі імкнуцца ў такіх умовах наведваць дзяржаву.

## Літаратура


1. Игнатченко, И.В. Туареги перекраивают карту Африки / И.В. Игнатченко // Независимое военное обозрение [Электронный ресурс]. – Режим доступа: http://nvo.ng.ru/gpolit/2012-05-25/1_tuaregi.html. – Дата доступа: 22.11.2015.
2. Филипов, В. Путч в Мали: причины и последствия / В. Филипов // Российский совет по международным делам [Электронный ресурс]. – Режим доступа: http://russiancouncil.ru/inner/?id_4=453#top-content. – Дата доступа: 23.11.2015.
3. Roger, B. Deux ans après l’opération Serval, où en est l’armée malienne? // Jeune Afrique [Ressource électronique]. – Mode d’accès: www.jeuneafrique.com/34583/ politique/deux-ans-apr-s-l-op-ration-serval-o-en-est-l-arm-e-malienne/. – La date de l’accès: 21.11.2015.
4. Mali: le MNLA dénonce l’accord de fusion avec les islamistes d’Ansar Dine // l’Expression [Ressource électronique]. – Mode d’accès: http://www.lexpressiondz.com/ linformation_en_continue/154586-mali-le-mnla-denonce-l-039-accord-de-fusion-avec-les-islamistes-d-039-ansar-dine.html. – La date de l’accès: 26.11.2015.
5. Непризнанные государства – Исламское государство Азавад // Геополитика [Электронный ресурс]. – Режим доступа: http://www.geopolitics.ru/2014/01/ nepriznannye-gosudarstva-islamskoe-gosudarstvo-azavad/. – Дата доступа: 23.11.2015.
6. French troops continue operation against Mali Islamists // BBC News [Electronic resource]. – Mode of access: http://www.bbc.com/news/world-africa-20997522. – Date of access: 27.11.2015.
7. Mali. Qui sont les islamistes à qui la France a déclaré la guerre ? // France Télévisions [Ressource électronique]. – Mode d’accès: http://www.francetvinfo.fr/monde/mali/mali-qui-sont-les-islamistes-a-qui-la-france-a-declare-la-guerre_203247.html. – La date de l’accès: 29.11.2015.
8. Matarese, M. Le chef des Touaregs islamistes est de retour / M. Matarese // Le Figaro [Ressource électronique]. – Mode d’accès: http://www.lefigaro.fr/international/2014/08/07/01003-20140807ARTFIG00252-le-chef-des-touaregs-islamistes-est-de-retour.php. – La date de l’accès: 27.11.2015.
9. Mali: Iyad ag Ghali, le rebelle touareg devenu djihadiste // l’Expression [Ressource électronique]. – Mode d’accès: http://www.lexpress.fr/actualite/monde/afrique/mali-iyad-ag-ghali-le-rebelle-touareg-devenu-djihadiste_1103497.html. – La date de l’accès: 29.11.2015.
10. Malagardis, M. A Bamako, l’autre Ansar ed-Dine fulmine / M. Malagardis // Libération [Ressource électronique]. – Mode d’accès: http://www.liberation.fr/planete/2013/01/25/a-bamako-l-autre-ansar-ed-dine-fulmine_876894. – La date de l’accès: 27.11.2015.
11. Le jihadiste Mokhtar Belmokhtar rompt avec Aqmi // Libération [Ressource électronique]. – Mode d’accès: http://www.liberation.fr/planete/2012/12/09/un-nouveau-groupe-islamiste-au-nord-mali_866308. – La date de l’accès: 28.11.2015.
12. Roger, B. Terrorisme: le groupe de Mokhtar Belmokhtar et le Mujao annoncent leur fusion / B. Roger // Jeune Afrique [Ressource électronique]. – Mode d’accès: http://www.jeuneafrique.com/168972/politique/terrorisme-le-groupe-de-mokhtar-belmokhtar-et-le-mujao-annoncent-leur-fusion/. – La date de l’accès: 28.11.2015.


*Паступіў у рэдакцыю 17.12.2015 г.*